# "...ВЪЗЕМШЕ МУЖСКУЮ КРЕПОСТЬ..." — ЖАНЧЫНА Ў СКАНДЫНАЎСКІМ І РУСКІМ ГРАМАДСТВАХ Ў КАНЦЫ РАННЯГА — ПАЧАТКУ ВЫСОКАГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА
# "... TAKING MALE FORTRESS ..." THE WOMAN IN THE SCANDINAVIAN AND RUSSIAN SOCIETIES AT THE END OF THE EARLY — THE BEGINNING OF HIGH MIDDLE AGES

Емяльянаў Сяргей Пятровіч
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: жанчына, "жаночая гісторыя", сацыяльная гісторыя, Сярэднявечча, Скандынавія, Русь, Ноўгарад, Полацк.

Рэзюме. Артыкул прысвечаны аналізу стану жанчыны ў рэгіёне Паўночнай Еўропы ў X — XII стст. Акрэсліваецца падабества статусу свабоднай жанчыны да статусу мужчыны паводле асноўных параметраў. Разглядаецца культурны грунт, на якім базавалася ацэнка жанчыны ў свядомасці эпохі. Аўтар прыходзіць да думкі аб наяўнасці для жанчыны магчымасці грамадскага і палітычнага удзелу ў дадзены гістарычны перыяд.

Keywords: woman, "women's history", social history, Middle Ages, Scandinavia, Ruś, Novgorod, Połack.

Summary.This article is the analysis of women's position in the North Europe region in the 10–12 cent. Status of free women and men are almost alike, according to the basic parameters. Cultural basis of attitude toward women in mentality of the era is considered in the article. The author comes to the conclusion that women had opportunities of social and political participation in the historical period.

Ведучы размову асобных аспектах жыцця грамадства, у тым ліку — публічных, сучасная гістарычная навука нярэдка ўжывае методыку погляду на гэтыя з'явы праз прызму той ці іншай групы: сацыяльнай, узроставай, культурнай і г.д. Асаблівую ўвагу прыцягваюць тыя катэгорыі людзей, якія па розных прычынах аказваліся слаба прадстаўленымі ў крыніцах, або не прадстаўленымі ўвогуле — гутарка ў такім выпадку, зразумела, вядзецца пра адсутнасць наўпроставай рэпрэзентацыі групы. Самі яе прадстаўнікі, відавочна, былі часткай гістарычнага працэсу і аказвалі на яго свой уплыў. Задача гісторыка тут заключаецца ў тым, каб праз ускосныя звесткі або фрагментарыя дадзеныя, ці, нават, лагічныя пабудовы, намаляваць абрысы і гістарычную ролю той ці іншай "схаванай" або "маўклівай" сацыяльнай катэгорыі.

Жанчыны акурат ўяўляюць сабой прыклад такой "маўклівай" групы. Да XX ст., калі ў значнай частцы краінаў адбылася палітыная і сацыяльная эмансіпацыя жанчыны, яе роля ў грамадскім жыцці нярэдка заставалася прыхаванай. Гэта, у сваю чаргу, спараджае ўяўленне пра адсутнасць такой ролі, пазбаўленасці жанчынаў магчымасцяў палітычнага ўплыву. Тым болей такія стэрэатыпы будуць існаваць адносна эпохі Ранняга-Высокага Сярэднявечча ў рэгіёне Паўночнай Еўропы, крыніцы па якой шмат у чым

зводзяцца да наратываў аб дзейнасці прадстаўнікоў палітычнай эліты, а роля шматлікіх сацыяльных катэгорыяў яўна не прасочваецца.

Прыступаючы да аналізу ролі жанчын ў грамадскім жыцці гэтай эпохі, варта акрэсліць спосабы пазбегнуць недахопу крыніц, а таксама вызначыць два важныя фактары, якія негатыўна ўплывалі на стан дадзенай групы, робячы саму эпоху па вызначэнні “маскуліннай”. Для вырашэння першай задачы неабходна пашырыць рэгіянальна-геаграфічны кантэкст, зважаючы на існаванне ў Паўночнай Еўропе адзінай культурна-цывілізацыйнай прасторы, вядомай як Скандабалтыйская цывілізацыя вікінгаў [1, с. 276]. Такая опцыя дазволіць прыцягваць большы спектр крыніц для рэканструкцыі агульнага стану жанчыны як грамадска-палітычнага актара. Другі аспект неабходны для характарыстыкі агульных умоваў эпохі, без разумення якіх немагчыма развязаць пастаўленую праблему.

Па-першае, размова вядзецца пра ўмовы эканамічна-гаспадарчага характару. Аграрная вытворчасць вымагала цяжкай фізічнай працы, якую мусіў ажыццяўляць мужчына. Усё яшчэ важныя для Еўрапейскай Поўначы X–XII стст. элементы прысвойваючай гаспадаркі, такія як паляванне (для кантынентальнай часткі) і рыбалоўства (для прыморскіх рэгіёнаў) таксама адносіліся да мужчынскіх заняткаў. Выжыванне цэлай сямейнай гаспадаркі без наяўнасці мужчынскіх рук было малаведагодным.

Па-другое, грамадска-палітычныя працэсы паўстання ранніх дзяржаваў таксама выносілі на першы план мужчыну. У цэнтры гэтых працэсаў былі князі, акружаныя вернымі дружыннікамі — разам яны ўтваралі сацыяльную групу па тыпе “мужчынскага саюзу”. На этапе ўтварэння патэстарных аб’яднанняў з князямі на чале такія групы ўжо знаходзіліся на вяршыні грамадскай іерархіі, а прадстаўнікі свабоднага насельніцтва таксама далучаліся да іх, хай і часова, у часе войнаў або вікінгаўскіх паходаў. Гэта, у сваю чаргу, спрыяла пашырэнню і замацаванню ўласцівага мілітарным мужчынскім аб’яднанням этасу. Менавіта ён, шмат у чым, складзе аснову светапогляду вышэйшых слаёў грамадства пазнейшых часоў.

Асоба жанчыны ў ваярскім этасе ацэньвлася неадназначна. Так, напрыклад, Hávamál (“Слова Высокага”), дыдактычная песня “Старэйшай Эды”, раіць:

| | |
|---|---|
| *Дзевы словам* | *Meyjar orðum* |
| *верыць не мусіш,* | *skyli manngi trúa* |
| *ды жонкі размовам —* | *né því, er kveðr kona,* |
| *на коле ганчарным* | *því at á hverfanda hvéli* |
| *іх створана сэрца,* | *váru þeim hjörtu sköpuð,* |
| *у грудзях іх пасдтупства.* | *brigð í brjóst of lagið.* [2] |

У той жа час, гэты ж твор надзяляе жанчыну магічнымі здольнасцямі (гл. строфы 146, 163), якія, разам з святарскімі функцыямі, адносіліся ў старажытных скандынаваў, у асноўным, да мужычынскай кампетэнцыі. Ужо на гэтым прыкладзе бачна складанасць персоны жанчыны ў тагачасным паўночным грамадстве, прынамсі, у вышэйшых яго групах.

Русь — рэгіён, утвораны пад уплывам скандынаваў, на ўсходзе Еўропы, у поўнай меры можна ўключаць у агульны кантэкст. У сувязі з гэтым, падаецца прасачыць ролю жанчыны у палітычным жыцці некаторых рускіх земляў, дапаўняючы вядомыя звесткі мясцовых крыніцаў дадзенымі па Скандынаўскім рэгіёне.

Рускія крыніцы падаюць тры яскравыя жаночыя постаці ў перыяд X — XII стст. Гэта княгіня Вольга, і дзве палачанкі з дынастыі Рагвалодавічаў — Рагнеда і Еўфрасіння (Прадслава). Акрамя таго, скандынаўскія крыніцы, што апісваюць падзеі на Русі, даволі яскрава малююць яшчэ дзвюх асобаў — Алогію (Allogia), жонку князя Уладзіміра Святаславіча, і Інгігерд (Jngigerde), жонку Яраслава Уладзіміравіча. Першая ўзгадваецца ў “Сазе пра Олафа Тругвасана” (Ólafs Saga Tryggvasonar), другая — ў “Эймундавай пасме” (Eymundar þáttr), частцы “Сагі пра Олафа Святога” (Ólafs saga ins helga).

Якія крытэры варта прыняць для разгляду статусу жанчыны? Падаецца, што тыя самыя, якія акэслівалі статус свабоднага мужчыны. Для дадзенай эпохі можна вызначыць тры выразныя прыкметы свабоды, кожная з якіх адначасова выступала як права і як абавязак вольнага чалавека. Па-першае, гэта валоданне зямлёй (сядзібай), па-другое — ўдзел у ваенных паходах, па-трэцяе — удзел у народных сходах (публічнай палітыцы). Да гэтых трох крытэраў варта дадаць чацверты, без якога цяжка казаць аб свабодзе асобы — магчымасць рабіць уласны выбар у той ці іншай сітуацыі.

Акрэсліваючы статус жанчыны ў Скандынавіі, А.Я. Гурэвіч справядліва заўважае, што яна па вызначэнні мусіла быць пад апекай бацькі, брата, мужа, або іншага сваяка мужчынскага полу. Гэта вынікала з самой традыцыі валодання зямлёй, калі гаспадаром мог быць толькі мужчына. Аднак, даследчык заўважаў, што крыніцы яскрава дэманструюць больш складаную рэчаіснасць — у іх нярэдка паўстаюць моцныя і ўладныя жанчыны [3, с. 25]. Арабскі пасол (верагодна, на тэрыторыю сучаснай Даніі) ал-Газаль прыводзіць такія словы знатнай нарманкі: *“Нашыя жанчыны пры нашых мужчынах толькі па сваім уласным выбары. Жанчына застаецца са сваім мужам толькі пакуль гэта задавальняе яе, і пакідае яго, калі гэта больш не радуе яе”* [4, p. 17].

Тое, што сітуацыя на Русі была падобнай добра бачна з “Рускай праўды”. З аднаго боку, свабдная жанчына абаранялася толькі паловай віры мужчыны (20 грывен супраць 40), аднак самім фактам пакарання тэкст закону прыроўнівае мужчынаў і жанчынаў *(“Оже кто оубьѥть женоу, то тѣмь же судомь соудити, ꙗко же и моужа...”* [5, с. 443]). Адносна маёмасных правоў, абаранялася нават права дачкі смерда (незамужняй), якая, у выпадку смерці бацькі, атрымлівала частку зямлі, якой той карыстаўся. “Задніцы”, што засталіся пасля свабодных, захоўваліся за іх жонкамі і дочкамі, безадносна таго, ці знаходзяцца апошнія ў дзявоцтве, ці ў шлюбе. Больш за тое, права жанчыны на зямлю дзейнічае нават пасля яе смерці — у выпадку смерці мужа сваякі першай жонкі, што памерла раней, маюць права на яе частку спадчыны. Жанчыне гарантавалася як зямля, што прыйшла з ёй

ва ўласнасць мужа ў якасці пасагу, так і тая, што была перададзена ёй мужам, згодна з запаветам [5, с. 443–444]. З кантэксту "Сагі пра Олафа Тругвасана" вынікае, што княгіня валодала нейкім уласным дваром у Ноўгарадзе, асобным ад двору князя. Таксама яна валодала і рухомай маёмасцю — калі малады Олаф здзяйсняе забойства, то князь Уладзімір прызначае віру на карысць наўгародскай грамады, якую за Олафа сплочвае княгіня [6, с. 166]. Гэтыя прыклады ўказваюць на тое, што жанчына эпохі, якая разглядаецца, адназначна валодала маёмаснымі правамі, хай і не была фармальна ўроўненая ў іх з мужчынам.

Што тычыцца ваеннай сферы, то тут, як падаецца на першы погляд, удзел жанчыны выглядаў бы дзіўным. Аднак, некаторыя аспекты ўказваюць на тое, што такі ўдзел меў месца. Таксама, як і ў выпадку зямельнага валодання, стандартным носбітам права/абавязку ваеннай службы быў мужчына. Але і жанчыны маглі аказвацца звязанымі з выкананнем гэтага абавязку. У межах скандынаўскай культуры вобраз жанчыны-ваяра меў сур'ёзны грунт, перш за ўсё ў форме ўяўленняў пра валькірыяў. Пранікалі такія вобразы і ў гістарычныя наратывы: так Саксон Граматык прыгадвае, што першай жонкай Рагнара Ладброка была нейкая Латгерта (Lathgertha — імаверна, лацінскае перайначанне скандынаўскага імя Hlaðgerðr), якую храніст параўноўвае з амазонкай. Яна ўдзельнічала ў бітвах *"prima inter promptissimos dimicabat"*[1] [7]. Але Латгерта, хутчэй за ўсё, выдуманы персанаж, як, магчыма, і сам Рагнар. Ці маюцца больш дакладныя звесткі аб ролі жанчыны ў вайне, прынамсі на Русі? Да першай з такіх зветак варта аднесці характарыстыку ўжо прыгаданай Алогіі, што вынікае з "Сагі пра Олафа Тругвасана". Згодна з гэтай крыніцай, княгіня мела не толькі свой двор, але і ўласную дружыну, якая наўпрост падпарадкоўвалася ёй, а памерамі раўнялася з дружынай князя [6, с. 183]. У крытычны момант, апісаны ў сазе, Алогія выстаўляе сваіх узброеных дружыннікаў супраць наўгародскай грамады, гатовая збройна абараняць Олафа [6, с. 166]. Варта адзначыць, што ў тэксце інфармацыя пра парытэт між дружынамі князя і княгіні і, нават, аб суперніцтве апошніх за лепшых дружыннікаў, суправаджаецца рэмаркай *"Þat var siðr mikill inna riku konunga..."*[2] [6, с, 162], што можа ўказваць на легендарны характар гэтай інфармацыі для часоў напісання вядомых версіяў сагі (канец XII — сярэдзіна XIII стст.). Аднак, побач з гэтым, маецца сюджт рускіх летапісаў аб "помсце княгіні Вольгі". І хоць на вайну з драўлянамі Вольга вязе непаўнагадовага сына Святаслава ў якасці сімвалу вайсковага кіраўніка, што асобна падкрэсліваецца ў крыніцы, зразумела, што менавіта сама княгіня, няхай і пры падтрымцы магутных дружынных правадыроў свайго забітага мужа, здзяйсняе агульнае кіраванне войскамі і вызначае стратэгію дзеянняў. Прыгадвае летапіс, дарэчы, і отракаў, то бок — малодшых асабістых дружыннікаў княгіні [8, с. 36–38].

---

[1] "…першай між рашучых змагаючыся" (лац.).
[2] "Такі быў звычай між магутных конунгаў…" (стараскандинав.)

Нарэшце, у аспекце палітычнага ўдзелу варта вызначыць, перш за ўсё, жанчынаў, што належылі да княскага стану. Так, Алогія збірае і праводзіць тынг [6, 142–143], а Вольга шмат гадоў кіруе краінай у якасці рэгента пры непаўнагадовым сыне. За гэты час яна прыймае пасольствы, сама наведвае Канстантынопаль, усталёўвае даніны, вядзе ваенныя дзеянні і г.д. [8, с. 35–41]. Аднак, больш стандартным было іншае становішча жанчыны — у ценю мужа або іншага сваяка, што акрэслівалася прыгаданымі вышэй прычынамі. Ці магла жанчына ўплываць на палітыку з гэтай пазіцыі? Відавочна, што так. Напрыклад, "Пасма пра Эймунда" малюе вобраз Інгігерд, жонкі Яраслава Уладзіміравіча, якая самым актыўным чынам удзельнічае ў палітыцы свайго мужа, як парадамі, так і дзеяннямі. Напрыклад, яна непасрэдна здзяйсняе спробу, праўда няўдалую, знішчэння Эймунда і яго людзей, калі тыя пажадалі пакінуць службу ў Яраслава [6, с. 316–317]. Сам галоўны герой так характарызуе жонку свайго князя-наймальніка: *"Trúum henni ekki, því at hon er konungi vitrari..."*[1]. Менавіта Інгігерд у выніку заключае мір паміж Яраславам і Брачыславам, згодна з версіяй "Пасмы…" [6, с. 318–319]. Такім чынам, жанчына паўстае ў тэкстах крыніцаў не ў якасці пасіўнага сузіральніка або проста аб'екту, вакол якога разгортваюцца падзеі, але актыўным актарам і ўдзельнікам гэтых падзеяў. Варта адзначыць, што такі стан жанчыны-актара мае пад сабой глыбокі культурны грунт. Эпічныя творы германа-скандынаўскіх народаў, якія захаваліся і дайшлі да нас, утрымліваюць менавіта такія жаночыя вобразы. У якасці прыкладу можна прыгадаць Гудрун з скандынаўскіх песняў пра Атлі (правадыра гунаў Атылу), якая помсцячы мужу за забітых братоў, спачатку корміць яго мясам уласных дзяцей, а потым забівае Атлі і спальвае ўсю яго сядзібу [9]. Жахлівыя і ірацыянальныя ўчынкі гэтай германскай Медэі — частка культурнага слою часоў, больш глыбокіх за эпоху мяжы Ранняга і Высокага Сярэднявечча. Тут няма месца ўзважанасці і разумнасці ўчынкаў герояў родавых ці каралеўскіх сагаў, або рускіх летапісаў. Але аўдыторыяй, якая спажывала гэткую эпічную культуру, былі менавіта людзі X-XII стст. [10, 78–79].

Магчыма, акурат гэтым культурным кантэкстам, дзе спалучаецца лёс і свабодная воля чалавека, і дзе жанчына можа дзейнічаць нароўных з мужчынам, і тлумачыцца логіка паводзінаў гераіняў гісторыі Полацкай зямлі, Рагнеды і Прадславы-Еўфрасінні? Прынамсі, такі падыход можа дапамагчы адказаць на фінальнае пытанне, датычнае свабоднай волі. Разглядаючы лёсы Рагнеды і Прадславы нельга не заўважыць, што абедзве яны яшчэ ў вельмі маладым узросце па ўласным жаданні і выбары адхіляюцца ад прапанаванага "простага" шляху, выракаючы сябе (а ў выпадку Рагнеды — цэлую зямлю) на больш складаную дарогу. Аднак, нельга казаць, што яны ідуць насуперак лёсу — іх учынкі якраз прадыктаваныя імкненнем адпавядаць свайму лёсу (у эпічна-язычніцкім яго разуменні). Рагнеда папросту не лічыла магчымым згадзіцца на прапанову Уладзіміра, а пасля была абавязаная, згодна з нормамі

[1] "Верыць ёй не будзем, бо яна за конунга разумнейшая…" (стараcканд.)

родавага права, помсціць за сваю сям’ю [11, с. 42–43]. Аналагічна, Прадслава, якая палічыла, што *яе лёс* заключаецца ў тым, каб стаць манахіняй, выступае насуперак волі бацькі. Такім чынам, бачна, што дыялектычнае перапляценне свабоды выбара і наканаванасці лёсу, якое характэрнае для свядомасці эпохі, вызначала паводзіны ня толькі мужчыны, але і жанчыны. Апошняя таксама рабілася ва ўласных вачах і вачах грамадства актыўным актарам, суб’ектам, які творыць гісторыю. Спалучэнне гэтых светапоглядных установак з апісанымі вышэй фармальнымі характарыстыкамі дазваляе стварыць завершаны тып свабоднай жанчыны Ранняга-Высокага Сярэднявечча, якая здольная абіраць і дзейнічаць, кажучы словамі з “Жыція” Еўфрасінні, *“...въземше мужскую крепость...”* [12, с. 27].

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Лебедев, Г.С. Эпоха викингов в Северной Европе и на Руси. / Г.С. Лебедев. — Санкт-Петербург, 2005. 640 с.

2. Hávamál. // Старшая Эдда — Sæmundar Edda / Norrcen Dýrð (Северная Слава) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://norse.ulver.com/edda/havamal.html. — Дата доступа: 09.04.2016.

3. Гуревич, А.Я. Походы викингов. / А.Я. Гуревич. — Москва, 2005. 208 с.

4. Ponz-Sanz, Sara M. Whom did al-Ghazãl meet? An exchance of embassies between the arabs from Al-Andalus and the vikings./ Sara M. Ponz-Sanz // Saga-Book, vol. XXVIII. — London, 2004. 155 p.

5. Правда Русская. Т. 1. Тексты. Под ред. В.Д. Грекова. — Москва, Ленинград, 1940. 505 с.

6. Джаксон, Т.Н. Исландские королевские саги о Восточной Европе. Тексты, перевод, комментарий. / Т.Н. Джаксон. — Москва, 2012. 779 с.

7. Saxo Grammaticus. Gesta Danorum. Liber IX. // Saxo Grammaticus. Gesta Danorum. / Norrcen Dýrð (Северная Слава) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://norse.ulver.com/src/other/saxo/09.html. — Дата доступа: 09.04.2016.

8. Ипатьевская летопись. Русские летописи. Т. 11. / подг. к изд. Цепковым А.И. Рязань, 2001. 672 с.

9. Atlakviða. Dauði Atla. // Старшая Эдда — Sæmundar Edda / Norrcen Dýrð (Северная Слава) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://norse.ulver.com/src/edda/atlak/on.html. — Дата доступа: 09.04.2016.

10. Гуревич, А.Я. Индивид и социум на средневековом Западе. / А.Я. Гуревич. — Санкт-Петербург, 2009. 481 с.

11. Никитин, А.Л. Текстология русских летописей (IX — начала XIVвв.). Вып. 2. Южно-русское и владимиро-суздальское летописание XII в. / А.Л. Никитин. — Москва, 2007. 487 с.

12. Кніга жыцій і хаджэнняў. / Уклад., прадм. і каментарыі А. Мельнікава. — Мінск, 1994. 503 с.